Источник: "Бібліятэчны свет" - 2013-06-28



Наталля Чуева

# БЕЛАРУСКАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ: ВЫНІКІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ



Дырэктар Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С. Пушкіна

У мінулым годзе Беларуская бібліятэчная асацыяцыя (ББА) адзначыла 20-годдзе з дня свайго заснавання. За гэты час асацыяцыя годна сцвердзіла сябе як ініцыятыўная і дзейсная форма грамадскага аб'яднання, і цяпер без яе цяжка ўжо ўявіць жыццё беларускай бібліятэчнай супольнасці.

Спынімся на працы Савета ББА мінулага склікання (2010–2013 гг.). Перад намі стаялі адказныя задачы: захоўваць набытыя традыцыі, не страціць лідэрства, творча працягваць стваральную дзейнасць ББА па фарміраванні аптымальных умоў развіцця бібліятэчнай справы з мэтай удасканальвання інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва і захавання нацыянальнай культурнай спадчыны, спрыяць прафесійнаму росту членаў асацыяцыі, павышэнню статуса бібліятэк і прэстыжу бібліятэчнай прафесіі ў грамадстве, што, дарэчы, замацавана Статутам арганізацыі. Зразумела, што здзяйсненне гэтых задач магчыма пры ўмовах актыўнай падтрымкі і кансалідацыі як мага большай колькасці бібліятэкараў краіны.

Аднак добра вядомы той факт, што грамадская дзейнасць – гэта прэрагатыва энергічных людзей з актыўнай жыццёвай і грамадзянскай пазіцыяй. На жаль, такія людзі ўвогуле ў меншасці, што яскрава адлюстроўвае і ўліковая статыстыка нашай арганізацыі: з 2009 г. колькасны склад ББА практычна не змяніўся. На 1 студзеня 2013 г. прайшлі перарэгістрацыю 1419 чалавек. Найбольшую частку членаў ББА складаюць прадстаўнікі бібліятэк, падпарадкаваных Міністэрству культуры – 1061, у тым ліку Нацыянальная бібліятэка Беларусі – 155 чалавек, бібліятэкі ВНУ прадстаўляюць 274 індывідуальных членаў, рэспубліканскія бібліятэкі – 80 чалавек, публічныя бібліятэкі – 906, 4 члены прадстаўляюць кнігагандлёвую і іншыя сферы. Па рэгіёнах сітуацыя выглядае так: г. Мінск – 38,7%; Мінская вобласць – 24,6%; г. Віцебск, Віцебская вобласць – 14,7%; г. Гомель, Гомельская вобласць – 11,6%; г. Магілёў, Магілёўская вобласць – 3,9%; г. Брэст, Брэсцкая вобласць – 2,7%; г. Гродна, Гродзенская вобласць – 0,8%.

Адсюль вынікае, што і сёння застаецца актуальнай праблема актыўнасці прафесіянальнай супольнасці. Найбольш ініцыятыўнымі і актыўнымі з'яўляюцца бібліятэкары, якія маюць 20 і болей гадоў прафесійнага стажу. Іх вопыт неабходна перадаваць моладзі, тым самым забяспечваць пераемнасць традыцый.

Аднак мы не можам сцвярджаць, што праблема вырашана, і гэта негатыўна ўплывае на нашу агульную працу. Такую праблемную сітуацыю можна прасачыць на прыкладзе складу камітэтаў ББА. Сёння мы маем 10 камітэтаў па асноўных кірунках бібліятэчнай дзейнасці. Фактычна ж працуюць толькі 8 з іх. Так, пасля выхаду па асабістым жаданні старшыні камітэта па бібліятэчных кадрах і непарыўнай адукацыі Стралковай Ірыны Барысаўны не знайшліся спецыялісты, якія б маглі прадоўжыць правядзенне школы дырэктараў «Искусство результативного управления», якая на працягу гадоў карысталася поспехам сярод калег.

На жаль, па суб'ектыўных прычынах не працаваў камітэт па інфармацыйнай культуры, які ўзначальваў Акуліч Уладзімір Антонавіч. А напрамак дзейнасці актуальны, бо сёння, у час інтэнсіўнай інфарматызацыі грамадства, бібліятэкам надзвычай важна мэтанакіравана і паслядоўна праводзіць навучанне дзяцей, падлеткаў, юнацтва асновам інфармацыйнай культуры. Тым больш што многія бібліятэкі валодаюць неабходнымі для гэтага сучаснымі тэхналогіямі і інфармацыйнымі рэсурсамі.

Імкнучыся да кансалідацыі бібліятэчнай супольнасці, развіваючы розныя формы бібліятэчнай кааперацыі, ББА абрала актуальным кірункам сваёй дзейнасці фарміраванне рэгіянальных міжведамасных бібліятэчных аб'яднанняў. Рэгіянальная інфраструктура ББА па-ранейшаму прадстаўлена двума аддзяленнямі: Гомельскім гарадскім і Барысаўскім раённым, якія ўносяць важкі ўклад у развіццё бібліятэчнага жыцця краіны.

На жаль, тэрытарыяльная структура асацыяцыі пакуль што не сфарміравана ў поўнай ступені. На абласным узроўні яшчэ не створана ніводнага аддзялення. Таму складана гаварыць пра перспектыву наступнага развіцця асацыяцыі.

Вырашэнне шэрагу актуальных задач павінна забяспечвацца на ўзроўні рэгіёнаў. Неабходна зазначыць, што, узяўшы на сябе ініцыятыву па правядзенні розных акцый і мерапрыемстваў, рэгіянальныя аддзяленні атрымаюць і пэўную фінансавую самастойнасць, бо ў іх распараджэнні застаецца частка членскіх узносаў.

Але не кожны спецыяліст і кіраўнік гатовы ўзяць на сябе дадатковыя абавязкі, якія не аплачваюцца, звязаныя не толькі з бібліятэчнай грамадскай нагрузкай, але і з фармальнымі пацэдурамі – рэгістрацыяй аддзялення, адкрыццём банкаўскага рахунку, афармленнем дамовы аб арэндзе і г. д.

У апошнія гады здзяйсняецца трансфармацыя бібліятэк рэспублікі ў сучасныя інфармацыйныя цэнтры са значнымі інфармацыйнымі рэсурсамі. Свой уклад у развіццё супрацоўніцтва бібліятэк у галіне электронных інфармацыйных рэсурсаў, у фарміраванне адзінай інфармацыйнай прасторы ў краіне робіць камітэт па інфармацыйных тэхналогіях (старшыня Юрык Іна Віктараўна). Праводзяцца навучальныя трэнінгі, канферэнцыі, семінары, накіраваныя на павышэнне прафесійнай кампетэнцыі бібліятэкараў і іх інфармаванасці ў сферы інфармацыйных і камунікатыўных тэхналогій. Юрык Іна Віктараўна сумесна з Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэкай

(РНТБ) прымала самы непасрэдны ўдзел у арганізацыі трох рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцый «Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі і тэхналогіі web 2.0 у бібліятэках»; неаднойчы выступала з лекцыямі-прэзентацыямі па папулярызацыі тэхналогій web 2.0 у бібліятэках Мінншчыны і Гомельшчыны. У межах супрацоўніцтва з інтэрнэт-парталам tut.by камітэт прыняў удзел у падрыхтоўцы праграмы «Интервью по понедельникам: зачем развивать открытый доступ к научным публикациям Беларуси».

Хачу таксама адзначыць добрасумленную працу Саладкова Аляксея Цімафеевіча, Лапо Пятра Міхайлавіча, Скалабана Аляксея Вітальевіча, якія прыклалі шмат намаганняў для развіцця інфармацыйных тэхналогій у бібліятэчнай справе.

Інфармацыйная служба ББА (Анохін Аляксандр Аляксандравіч) заўсёды трымае ў полі зроку такія сродкі прафесійнай камунікацыі, як вэб-сайт ББА, бібліятэчны блог, электронныя спісы рассылкі, праз якія бібліятэкары рэспублікі інфармуюцца аб дзейнасці асацыяцыі.

Прафесійныя часопісы «Бібліятэчны свет» і «Бібліятэка прапануе» – своеасаблівы рупар ББА – дазваляюць бібліятэчнай супольнасці сачыць за шматлікімі падзеямі, якія адбываюцца ў нашай галіне.

У 2010 г. сайт асацыяцыі (www.bla.by) пераведзены на новы хостынг і новую праграмную платформу. Дызайн сайта стаў больш прывабным, палепшылася навігацыя, з'явіліся новыя сервісныя магчымасці.

Але, на жаль, кантэнт сайта сёння нельга назваць задавальняючым. Менавіта таму пажадана распрацаваць палажэнне аб сайце асацыяцыі, размеркаваць абавязкі па падрыхтоўцы асобных раздзелаў сайта, іх аднаўленні і г. д.

У цэнтры ўвагі ББА пастаянна знаходзяцца пытанні ўдасканальвання і развіцця нарматыўна-прававой базы бібліятэк рэспублікі (старшыня камітэта Пшыбытка Марына Георгіеўна). На міжведамасным узроўні пры непасрэдным удзеле членаў асацыяцыі ажыццяўлялася работа па распрацоўцы і актуалізацыі каля 20 нарматыўных прававых дакументаў, якія рэгламентуюць дзейнасць бібліятэк краіны. Сярод іх «Канцэптуальныя асновы развіцця бібліятэчнай справы Рэспублікі Беларусь на перыяд 2011–2015 гг.», якія ляглі ў аснову дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі на 2011–2015 гг.»; Закон Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах»; канцэпцыя закона «Аб унясенні змен і дапаўненняў» у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь»; «Палажэнне аб публічным цэнтры прававой інфармацыі»; метадычныя парады па інтэграцыі (аб'яднанні) сельскіх публічных бібліятэк і бібліятэк устаноў агульнай сярэдняй адукацыі і арганізацыі іх дзейнасці.

Сістэма мер, накіраваных на падрымку і развіццё чытання ў Рэспубліцы Беларусь у 2013–2015 гг. і іншыя дакументы.

На жаль, шэраг дакументаў пакуль застаюцца незацверджанымі. Сярод іх такія важныя, як «Інструкцыя па ўліку і захаванасці бібліятэчных фондаў у Рэспубліцы Беларусь», «Інструкцыя аб умовах стварэння бібліятэк, парадку арганізацыі і дзейнасці сеткі бібліятэк», «Інструкцыя аб парадку арганізацыі і функцыянавання нацыянальнай сістэмы міжбібліятэчнага абанемента і дастаўкі дакументаў Рэспублікі Беларусь» і інш.

Хачу спыніцца на гуманітарна-асветніцкай дзейнасці бібліятэчнай асацыяцыі. Нельга пераацаніць заслугі ў гэтым кірунку камітэта па ахове кніжных помнікаў (старшыня Кірэева Галіна Уладзіміраўна). Менавіта дзякуючы намаганням гэтага камітэта ствараецца культурны імідж нашай краіны, мы знаёмім сусветную супольнасць з помнікамі беларускай кніжнай культуры. Камітэт вядзе актыўную навукова-даследчую работу ў галіне тэорыі і метадалогіі кніжнай культуры, кнігазнаўства, помніказнаўства, што спрыяе развіццю нацыянальнай кнігазнаўчай школы.

Высокую адзнаку ў бібліятэчных колах атрымаў семінар «Кніжная культура ў інфармацыйным грамадстве», арганізаваны пры фінансавай падтрымцы ББА ў красавіку 2011 г. У межах семінара прайшлі круглыя сталы: «Кніга як фактар міжкультурнай камунікацыі» з удзелам Сакалова Аркадзія Васільевіча, доктара педагагічных навук, прафесара Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і «Кніга як фактар культуры і прадмет навуковых даследаванняў» з удзелам Кшыштафа Міганя, доктара габелетаванага інстытута бібліятэказнаўства і навуковай інфармацыі Вроцлаўскага ўніверсітэта.

У 2012 г., які быў аб'яўлены Годам кнігі, камітэт па ахове кніжных помнікаў штомесячна прымаў удзел у рэалізацыі праекта «Бібліяфільскія сустрэчы Ad-librym» на базе кнігарні «Кніжны салон». У межах праекта паспяхова прайшлі прэзентацыі кніг, сустрэчы з пісьменнікамі, мастакамі кнігі. Праводзіліся пасяджэнні, прысвечаныя пытанням бібліяфільства і кнігазнаўства: «Аўтограф: сур'ёзны і кур'ёзны», «Кніжная графіка і экслібрысы Арлена Кашкурэвіча», «Бібліяфілы другой паловы 20 стагоддзя ў Мінску» і г. д.

Важным аспектам дзейнасці ББА з'яўляецца садзейнічанне прафесійнаму развіццю бібліятэкараў рэспублікі, павышэнне статуса бібліятэк і бібліятэчнай прафесіі ў грамадстве. Штогод пад эгідай ББА рознымі камітэтамі праводзяцца буйныя міжнародныя канферэнцыі, шматлікія семінары, круглыя сталы па самых актуальных пытаннях бібліятэчнай практыкі.

Добры плён прынёс прафесійны візіт беларускіх спецыялістаў у 2010 г. у бібліятэкі Пскоўскай вобласці з удзелам у Міжнароднай школе якасці па тэме: «Менеджмент якасці ў бібліятэчнай дзейнасці». Падрыхтоўка школы здзяйснялася сумесна членамі Беларускай і Расійскай бібліятэчных асацыяцый пры падрымцы Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі. Набытыя веды і вопыт знайшлі прымяненне ў практыцы работы многіх бібліятэк нашай краіны. Удзельнікі таксама наведалі цудоўныя паэтычныя мясціны – Міхайлаўскае, Пскова-Пячэрскую Лаўру. Цёплыя ўспаміны надоўга застануцца ў памяці кожнага.

Савет ББА разглядае кансалідацыю бібліятэкараў Беларусі ў кантэксце развіцця і ўмацавання сувязяў з міжнароднай бібліятэчнай супольнасцю. Станоўчым момантам у дзейнасці Савета асацыяцыі з'яўляецца тое, што на працягу справаздачнага перыяду мы не страцілі членства ІФЛА, знаходзілі магчымасць для выплаты членскага ўзносу. У 2012 г. ББА падпісала двухбаковыя пагадненні аб супрацоўніцтве з Расійскай бібліятэчнай асацыяцыяй і Украінскай бібліятэчнай асацыяцыяй, а таксама мемарандум аб супрацоўніцтве па ўмацаванні бібліятэчных асацыяцый СНД.

Неабходна адзначыць актыўную работу камітэта па міжнародных сувязях (старшыня Сяргей Вікенцьевіч Шандора). Мы шчыра ўдзячныя персанальна Шандору Сяргею Вікенцьевічу і Лапо Пятру Міхайлавічу за магчымасць здзяйснення важных у прафесійнам плане замежных паездак беларускіх бібліятэкараў, якія сталі ўжо трывалай традыцыяй.

На працягу 2010–2013 гг. 190 беларускіх бібліятэкараў з 52 бібліятэк, ад вясковай да Нацыянальнай, з розных куткоў Беларусі, наведалі 12 краін Еўропы, дзе знаёміліся са станам і арганізацыяй бібліятэчнай справы ў нацыянальных, публічных і ўніверсітэцкіх бібліятэках 24 гарадоў, а таксама мелі магчымасць наведаць знакамітыя музеі, карцінныя галерэі, паркі і пабачыць гісторыка-архітэктурныя помнікі Германіі, Францыі, Швейцарыі, Польшчы, Эстоніі, Швецыі,

Бельгіі, Нідэрландаў, Люксембурга, Велікабрытаніі. Падчас візітаў праводзіліся семінары і круглыя сталы па актуальных праблемах бібліятэчнай справы і развіцці прафесійнага міжнароднага супрацоўніцтва. У гэтым годзе ва ўніверсітэцкай бібліятэцы Эдынбурга і інстытуце бібліятэчных і інфармацыйных спецыялістаў у Лондане паспяхова прайшоў круглы стол па актуальных праблемах узаемадзеяння брытанскіх і беларускіх бібліятэкараў. У знакамітым Оксфардзе беларусы азнаёміліся з выдавецкай дзейнасцю і інфармацыйнымі прадуктамі выдавецтва «Oxford University Press» і інш.

Асацыяцыя не мае магчымасці фінансаваць такія візіты, але забяспечвае пошук эканамічных варыянтаў паездак і распрацоўку маршрутаў, якія аптымальна спалучаюць прафесійную і турыстычную праграмы.

Нельга абысці ўвагай і такі момант у дзейнасці ББА, як супрацоўніцтва з інфармацыйна-культурнымі цэнтрамі пры замежных пасольствах у Беларусі.

Знакавай падзеяй у жыцці бібліятэчнай супольнасці краіны стаў ініцыяваны Саветам ББА Форум бібліятэкараў Беларусі «Гуманітарна-асветніцкая дзейнасць бібліятэк у кантэксце агульначалавечых каштоўнасцяў і беларускай дзяржаўнасці», праведзены пад эгідай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. А той факт, што сёння мы сабраліся на трэці Форум бібліятэкараў Беларусі, сведчыць аб жыццяздольнасці гэтага важнага мерапрыемства, у якім прымаюць удзел звыш 400 спецыялістаў бібліятэк розных міністэрстваў і ведамстваў рэспублікі.

Безумоўна, значэнне мае і тое, што форумы далі магчымасць прыцягнуць увагу дзяржаўных органаў кіравання да праблем і патрэб бібліятэк. Так, многія прапановы ўдзельнікаў форумаў знайшлі сваё адлюстраванне ў дзяржаўнай праграме «Культура Беларусі на 2011–2015 гг.». У гэтым годзе Міністэрства культуры прафінансавала трэці форум, і я, карыстаючыся выпадкам, хачу выказаць шчырую ўдзячнасць Міністэрству культуры ў асобе намесніка Міністра культуры Васіля Мечыслававіча Чэрніка, які сёння прымае ўдзел у працы нашага Форума, за такую важкую падтрымку.

Апрача насычанай прафесійнай праграмы, форумы даюць выдатную магчымасць развіцця нефармальных кантактаў сярод бібліятэкараў. Гэтаму спрыяе і выбар месца правядзення мерапрыемства – база адпачынку у наваколлі Мінска.

Інтарэсы бібліятэчных супрацоўнікаў, членаў ББА, прадстаўляў камітэт па сацыяльнай і прававой абароне (старшыня Макаранка Лідзія Іванаўна), які сістэматычна праводзіў кансультацыі, адказваў на старонках часопіса «Бібліятэка прапануе» на дасланыя ў камітэт пісьмы супрацоўнікаў бібліятэк.

У практыку работы ББА трывала ўвайшла традыцыя праводзіць сустрэчы ветэранаў бібліятэчнай справы. Мерапрыемствы рыхтуюцца сумесна з міжведамасным гарадскім бібліятэчным саветам (старшыня Сяткоўская Надзея Паўлаўна) пры падтрымцы ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама. У мінулым годзе гэта сустрэча адбылася ў канцэртнай зале «Верхні горад», сёлета – у Мінскай гарадской ратушы. Для ветэранаў гэта магчымасць убачыцца, успомніць лепшыя дні працоўнай дзейнасці, паслухаць канцэрт, сустрэцца з беларускімі пісьменнікамі і ўвогуле адчуць сябе не забытымі грамадствам.

Шчыры дзякуй ад імя Савета паважаным Надзеі Паўлаўне Сяткоўскай і Марыне Дзмітрыеўне Ясюк за падтрымку і супрацоўніцтва.

Улічваючы плённую працу міжведамаснага гарадскога бібліятэчнага савета, на думку многіх членаў ББА, ёсць усе перадумовы для стварэння Мінскага гарадскога аддзялення Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі.

Пачынаючы з 2001 г. беларуская грамадскасць 15 верасня адзначае Дзень бібліятэк. Апошнія 3 гады на гэтым свяце ББА сумесна з міжведамасным гарадскім бібліятэчным саветам праводзіць рытуал прысвячэння ў прафесію. Мы прымаем у сваю бібліятэчную сям'ю выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі. У 2011 г. да Дня бібліятэк было прымеркавана правядзенне конкурсу «Сам сабе мастак», у якім прынялі ўдзел супрацоўнікі бібліятэк усіх рэгіёнаў нашай краіны. Падчас урачыстасцяў у мастацкай галерэі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылося адкрыццё выніковай выставы і ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу. Усяго на конкурс было прадстаўлена 347 твораў. Беларуская бібліятэчная асацыяцыя шмат папрацавала ў напрамку папулярызацыі чытання і кнігі ў 2012 г., аб'яўленым Годам кнігі. Былі арганізаваны шматлікія сустрэчы чытачоў з літаратарамі, абмеркаванні кніжных навінак, прэзентацыі твораў, чытацкія канферэнцыі і іншыя мерапрыемствы. Неабходна адзначыць працу камітэта па арганізацыі абслугоўвання дзяцей і падлеткаў (старшыня Швед Таццяна Аляксееўна), які прыклаў шмат стараннаў для арганізацыі цікавых і карысных мерапрыемстваў па прыцягненні падрастаючага пакалення да чытання. Так, на базе цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэкі імя М. Астроўскага паспяхова праведзены круглы стол «Літаратура на беларускай мове: чытанне, папулярызацыя, праблемы», навукова-практычная канферэнцыя «Дзіцячая бібліятэка – цэнтр атрымання інфармацыі для дзяцей і юнацтва», міжнародная канферэнцыя «Бібліятэка і інавацыі ў абслугоўванні дзяцей і падлеткаў». Штогод Беларуская бібліятэчная асацыяцыя прымае ўдзел у Мінскім міжнародным кніжным кірмашы, што дазваляе прапагандаваць як саму асацыяцыю, так і дзейнасць бібліятэк праз шматлікія друкаваныя матэрыялы. На жаль, на стэндзе асацыяцыі прадстаўляюцца рэкламныя матэрыялы толькі бібліятэк г. Мінска. Між тым удзел у кірмашы дае магчымасць бібліятэкам рэспублікі наладжваць кантакты з выдавецтвамі, кнігагандлёвымі арганізацыямі, удзельнічаць у круглых сталах, што садзейнічае якаснаму ўдасканальванню іх інфармацыйных рэсурсаў.

Адзначыўшы пазітыўныя моманты ў працы Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі за справаздачны перыяд, мы мусім прызнаць, што былі і пэўныя пралікі і недахопы, як па аб'ектыўных так і па суб'ектыўных прычынах.

Сёння перад асацыяцыяй стаіць дастаткова многа актуальных задач. З нашага вопыту вынікае, што неабходна папоўніць пакет асноўных дакументаў, якія рэгламентуюць дзейнасць ББА. Патрабуецца больш дакладнае акрэсліванне формаў і кірункаў дзейнасці ў межах асобных структур асацыяцыі, што дазволіць бібліятэчным спецыялістам краіны лепш разумець і ацэньваць працу камітэтаў, адрасна ўносіць прапановы па павышэнні эфектыўнасці дзейнасці асацыяцыі. Для развіцця прафесійнай самасвядомасці спецыялістаў патрабуецца актуалізацыя дзеючага «Кодэкса прафесійнай этыкі бібліятэкараў Беларусі», у якім сфармуляваны асноўныя прыярытэты бібліятэчнай прафесіі. Магчыма ў бліжэйшы час мы падыдзем да распрацоўкі канцэпцыі, у якой знойдзе адлюстраванне новая стратэгія развіцця асацыяцыі на бліжэйшую перспектыву. Спадзяёмся, што ББА годна справіцца з гэтай задачай, дзякуючы настойліваму імкненню бібліятэчных спецыялістаў да аб'яднання з мэтай вырашэння агульнымі намаганнямі важных праблем у сваёй прафесійнай дзейнасці.

## Summary

The article describes the activities of the Belarusian Library Association in 2010–2013.